# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

17 снежня 2025 г. № 440 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту пастанаўляю:

1. За значны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2025 года ў памеры 350 базавых велічынь кожнаму:

калектыву рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб’яднання ”Прэзідэнцкі спартыўны клуб“;

Літвіновічу Івану Уладзіміравічу, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па скачках на батуце ўстановы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па гімнастычных відах спорту“;

Мірановічу Спартаку Пятровічу, аператару відэазапісу мужчынскай асноўнай спартыўнай каманды дзяржаўнай установы ”Гандбольны клуб ”СКА-Мінск“.

2. Міністэрству фінансаў у 2026 годзе выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2025 года з улікам памеру базавай велічыні на дату выплаты.

3. Вызваліць сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2025 года, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ · 1 ·
Для правовых актов

10